мейного предпринимательства вносят заметный вклад в производство материальных благ, в улучшение благосостояния семьи, расширяют ее воспитательный потенциал.

Влияние экономической функции на взаимоотношения в семейном коллективе может быть двояким: справедливое распределение домашних обязанностей в семье между супругами, старшим и младшим поколениями, как правило, благоприятствуют укреплению супружеских отношений, нравственному и трудовому воспитанию детей. При несправедливом распределении домашних обязанностей в семье, когда они взваливаются в основном на женщину, мужчина выступает в роли «патриарха», дети — в роли потребителей, микроклимат в такой семье, безусловно, будет неблагоприятным. Экономическая функция теснейшим образом связана с экзистенциальной функцией семьи, в трансформационном обществе она претерпела ряд изменений. Семья как самостоятельная ячейка может влиять на экономические отношения в обществе. Об этом говорит появление таких новых структур экономической деятельности, как семейные фирмы, фермерские хозяйства, экологический сельский туризм и др. Домашнее хозяйство городских семей имеет преимущественно потребительскую направленность. Ученые выделяют следующие типы домашнего хозяйства городских семей: хозяйства почти с полным отсутствием домашнего производства, хозяйства с любительскими занятиями (ремонт одежды, шитье, ремонт обуви, ремонт домашней техники и т.д.), а также дачное домашнее хозяйство, связанное с производством садово-огородной продукции преимущественно для личного потребления. Сельские же семьи кроме домашнего хозяйства имеют приусадебные участки, и их хозяйство можно охарактеризовать как производственное.

Социально-экономические особенности функционирования домашнего хозяйства определяют потребительское поведение семьи. На базе домашнего хозяйства семья не только непосредственно осуществляет процесс потребления, но и готовит, и обслуживает его. Потребительское поведение семьи зависит от ее состава, дохода, места проживания, наличия подсобного хозяйства и др. Производство и потребление в семье — это не только экономическое поведение, но и социальная деятельность, с помощью которой семья обеспечивает воспроизводство своих социальных характеристик.

***Л.І. Падгайская,*** *канд. сацыял. навук*
*БДЭУ (Мінск)*

## ФАРМІРАВАННЕ СЯРЭДНЯГА КЛАСА БЕЛАРУСКАГА ГРАМАДСТВА (ПРАБЛЕМА СПРАВЯДЛІВАСЦІ)

Эканамічная сацыялогія — навука міждысцыплінарная. Яна вывучае эканамічныя працэсы праз прызму сацыяльных адносін. У постса-

вецкім грамадстве праблема справядлівасці вырашалася пераважна праз асераднёнасць і аднолькавасць аплаты працы. Так быў сфарміраваны базавы пласт, які складаў платформу постсавецкага грамадства і меў эканамічныя паводзіны дарынкавага тыпу: мінімум намаганняў — мінімум даходу. У беларускім грамадстве ў пачатку XXI ст., як і ў постсавецкім, базавы пласт прадстаўляе яго сацыяльную платформу. Ён валодае дастатковым патэнцыялам, але не валодае дастатковымі матэрыяльнымі рэсурсамі і знаходзіцца ў стане простага ўзнаўлення сваёй сілы. Таму базавы пласт беларускага грамадства пакуль мала прыдатны ў якасці сацыяльнага агента прагрэсу. Ён валодае, безумоўна, функцыяй дыверсіфікацыі, бо ўбірае ў сябе мноства слаёў беларускага грамадства, а таксама стабілізуючай функцыяй, але валодае гэтымі функцыямі зусім у іншым выглядзе, чым класічны сярэдні клас. У матэрыяльнай сферы — гэта простае ўзнаўленне сваёй рабочай сілы, у нематэрыяльнай сферы — антырынкавыя настроі, сфармаваныя яшчэ постсавецкім асяроддзем. І як следства — гэты сярэдні пласт беларускага грамадства маламабільны. Ён мае эканамічную інэртнасць, а таксама слабую ўнутраную мабільнасць. Беларускія сацыёлагі, якія вывучаюць сярэдні клас знутры, фіксуюць той факт, што самаідэнтыфікацыя з сярэднім класам у беларускіх рэспандэнтаў дасягае да 50 % і вышэй. Але ў рэальнасці — гэта людзі не сярэдняга класа, а сярэдняга дастатку. Абмежаваная дзелавая і творчая актыўнасць яго прадстаўнікоў перашкаджае пашырэнню яго творчага капіталу. Гэты пласт мае недастатковую удзельную вагу і слабы інтэлектуальны ўплыў. Як жа палепшыць гэта становішча? Па-першае, праз паспяховае правядзенне рынкавых рэформаў. Па-другое, праз дзяржаўную абарону прыватнай уласнасці. Але пры ажыццяўленні гэтых рэформаў узнікае пытанне аб сацыяльнай справядлівасці. Уяўленні пра справядлівасць у беларускім грамадстве цесна звязаны з правам на справядлівую заработную плату, бо гэта права, вытворнае ад права на жыццё, працу і павагу ў грамадстве.

У замежнай сацыяльнай думцы праблема справядлівасці разглядалася ў кантэксце суадносін: індывідуалізм-калектывізм, свабода-роўнасць. Змястоўныя аспекты справядлівасці, як правіла, не мелі універсальнага характару. Яны як у мінулым, так і сучаснасці насілі і носяць маральную, эканамічную, палітычную, культурную, прававую складаную. У розныя перыяды развіцця канкрэтнага грамадства адна або некалькі складаных маглі вызначаць вектар яго далейшага развіцця. У культурна-гістарычным кантэксце яна ёсць пастаянна зменлівая мера роўнасці і свабоды людзей, грамадстваў, дзяржаў. Практычна ўсе сучасныя сацыяльна-структураваныя грамадства знаходзяцца ў пошуках аптымальных суадносін паміж свабодай і роўнасцю. Шматлікія апытанні, якія праводзяцца ў розных краінах, — усходне-еўрапейскіх і заходне-еўрапейскіх — сведчаць аб тым, што любая дзяржава павінна забяспечваць свайму народу і справядлівасць, і свабоду, і роўнасць магчымасцяў і ўмоў. Пры гэтым варта адзначыць, што справядлівасць з'яўляецца не толькі базавай каштоўнасцю левай ідэалогіі, а свабода —

не толькі ліберальнай каштоўнасцю. Макс Вэбер адным з першых у працы «Гаспадарка і грамадства» паказаў важнасць адносін размеркавання ў структуры сацыяльнага парадку. З яго пункту гледжання паміж асноўнымі сацыяльнымі групамі размяркоўваюцца не толькі даходы і ўласнасць, але ўлада і прэстыж. Так фармуецца няроўнасць паміж асноўнымі сацыяльнымі групамі, якая паўтараецца і замацоўваецца ў сацыяльных адносінах. Катэгорыя «няроўнасць» стала асноўнай у дыскурсе сацыялогіі. Сацыялогія вызначыла і функцыянальнае прызначэнне няроўнага размеркавання. На думку Кінгслі Дэвіса і Уілберта Мура, праз стратыфікацыю, гэта значыць размеркаванне індывідаў па сацыяльных слаях адбываецца фарміраванне агульнага парадку ў грамадстве. А любое спарадкаванае грамадства, у процівагу хаосу больш эфектыўна. Прычым К. Дэвіс і У. Мур лічылі, што толькі невялікая колькасць людзей у любым грамадстве валодае здольнасцямі, якія даюць магчымасць выконваць больш адказныя функцыі, і адпаведна павінна атрымліваць большыя выгоды. Стратыфікацыя забяспечвае матывацыю дзеяння — тыя, хто унізе, хочуць падняцца наверх, а тыя, хто ўжо там, ўсяляк хочуць ўтрымацца. Такім чынам, грамадскія адносіны размеркавання — гэта не толькі аб'ектыўны грамадскі працэс, але адначасова і працэс ўсьведамленьня перспектыў і ацэньвання вынікаў гэтага размеркавання. Вось для гэтага ацэньвання і неабходна ў сацыялогіі паняцце справядлівасці: ці адпавядае размеркаванне дабротаў заслугам індывідаў у сацыяльнай супольнасці? Гэта значыць паняцце і пачуццё справядлівасці неабходны як мера ў ацэнцы працэсу і вынікаў размеркавання і абмену.

***С.П. Романова,*** *канд. социол. наук, доцент*
*БГЭУ (Минск)*

## СОЦИАЛЬНО-ЭКОНОМИЧЕСКОЕ НЕРАВЕНСТВО С ПОЗИЦИЙ РЫНОЧНОГО ЛИБЕРАЛИЗМА: ВЗАИМОСВЯЗЬ ТЕОРИИ И ПРАКТИКИ

Идеи рыночных либералов (неолибералов, или новых правых) распространились в западной общественной мысли и практике в 1980-е гг. Американский экономист Милтон Фридман в работе «Капитализм и свобода» (1962) и австро-английский экономист и философ Фридрих Хайек в своей работе «Дорога к рабству» (1944) изложили идеи, которые легли в основу современного рыночного либерального мышления. Однако следует отметить, что идеи рыночного либерализма берут свое начало в теориях либерализма XIX в., в которых свободный рынок в капиталистической экономике считался наилучшей основой для организации системы неравенства в обществе. Основным тезисом было то, что рыночные силы способствуют конкуренции, которая в свою очередь стимулирует инновации и производительность. Бизнес-предприятие